Ала Сямёнава



...Ёсьць — галоўнае.

Ёсьць — грошы. Усё — о’кей!..

# О’Кей!

***З нізкі «Тайбрэк»***

***ЗДЫМАК***

Ён гаварыў пра Бога. У інтанацыях маналогу-споведзі. Хаця сам ня верыў ні ў Бога, ні ў д’ябла, а толькі ў свой шчасьлівы шанец. Скарыстаць гэты шанец ён умеў — здабыўшы, выдрапаўшы з горла.

Ён быў пестуном выпадку. І тыя выпадкі прысьпешваў, прыстасоўваў, выкарыстоўваў. Абставіны — таксама. Гістарычныя, арганізацыйныя, побытавыя. Ён меў амаль усе званьні ды ўзнагароды, якія мог мець мастак у ягонай краіне. Персанальныя выставы былі для яго зьявай звычайнай. Ва ўсе часы. Ён умеў, не выдаючы артадоксам, балансаваць паміж уладай і калегамі, крытыкамі і пакупнікамі, чыноўнікамі і выкшталцонымі наведвальнікамі май-

стэрняў і прэзентацыяў. Ён умеў спадабацца і так званаму масаваму гледачу. Любіў выступленьні, сустрэчы, інтэрв'ю.

Зьнешне ён таксама трымаў сябе паміж тыповым багемным персанажам і афіцыйнай асобай. Не пінжак, а камізэля, аднак не з якога аксаміту або вельвету, а з мяккай воўны добрага гатунку. Кашуляапаш — і аднакалёрная хустачка на шыі.

...У гэтай невялікай студыі ён апынуўся далёка не ўпершыню. Любіў яе — ніякіх навацыяў, утульныя фатэлі, паліцы — ці то з кнігамі, ці то з імітацыямі карэньчыкаў. У маніторы яны добра глядзеліся — ён і жанчына, што брала ў яго інтэрв'ю. «Трэба будзе абавязкова нейкае «дзейства» з ёю задзейнічаць у фільме, што зьбіраюцца рабіць пра мяне», — падумаў ён, слухаючы чарговае пытаньне жанчыны. Прыгожая жанчына! Шэрыя халаднаватыя вочы, тонкі стан, выдатная пастава! Якая натура была б! Але гаварыў ён тымчасам пра Рафаэля, Мікелянджэла, Рублёва, Лазара Богшу, пра сваё падарожжа ў Ерусалім, пра сваё разуменьне Пісаньня (чытаў некалькі дзён кніжкі, якія яму падрыхтавала жонка — лепшай сакратаркі ня знойдзеш!).

— Дзякуй вам за зьмястоўную гаворку, — сказала жанчына. Ён падняўся з фатэлю і карцінна нахіліў галаву. Ведаў, што гэты рух адпрацаваны ім бездакорна.

— Выбачайце, мне здаецца, нашае супрацоўніцтва павінна мець працяг, — ён крануў журналістку за локаць — лакаток.

— З задавальненьнем,— не зусім у лад адказала жанчына. — Дарэчы, я знайшла ў нашым архіве некалькі здымкаў, якіх, можа, няма ў вас. Зірніце.

— Гляну, — весела адказаў ён, не адрываючы вачэй ад выразна падкрэсьленай вопраткай постаці жанчыны.

...У рабочым пакоі інтэрв'юеркі нікога не было, і ён, гледзячы жанчыне ў вочы, спакойна давёў:

— Распачынаюць здымаць фільм... Біяграфічны... Пра маю сьціплую персону... Будуць здымкі ў Італіі, там я некалі стажыраваўся... Там жыве мой даўні сябар...

— О-о-о! — з цікавасьцю паглядзела на мастака жанчына. — Але — вось здымкі.

Яна адчыніла шуфляду стала і дастала некалькі здымкаў у канверце, потым пачала яшчэ нешта шукаць у шуфлядзе. З яе рук выпаў канверт, і з яго паляцеў на падлогу фотаздымак дзяўчыны ў жакейскім убраньні, яна трымала за аброць прыгожага каня. Твар — з выклікам і хітрынкай, а конь ганарліва косіць вокам.

Ён пазнаў дзяўчыну. Ня ведаў, што яна захаплялася конным спортам. Затое памятаў, што яна была некалі знакамітая. Яе раманс «Вясновыя чары» ледзь ня кожнага дня выконвалі па радыё, сьпявалі па ўсёй краіне, творы яе лічылі за гонар пакласьці на музыку кампазітары, выходзілі кніжкі яе вершаў.

Яе паэзіі — хутчэй так...

Ён загарэўся быў рабіць яе партрэт. Але яна прыходзіла пазіраваць без асобай ахвоты, потым некуды зьехала, пазьней у яго зьявіліся важныя заказы, трапілася цікавая творчая вандроўка на Поўнач. Партрэт так і застаўся нясканчаным.

Паэтэса, здаецца, ня стала горш пісаць, але былой славы ўжо ня мела. Не надарылася і прэміяў, ганаровых званьняў. Характар у яе быў ганарлівы, язык — што нож востры... І неяк, пару год таму, яна нечакана патэлефанавала яму. Ён узначальваў адзін, толькі што арганізаваны фонд. І фонд часам разьмяркоўваў гранты творчым асобам. Яна прасіла пасрыяць... Трэба было хоць крыху ведаць яе, каб уявіць, што гэта для яе — прасіць... І ён паабяцаў. І ня выканаў просьбу. Спатрэбіўся грант сыну ўплывовага чалавека, грошы — даўняй пасіі, яшчэ нешта некаму... Адным словам, паэтэса выпала з-пад ягонае ўвагі. Больш яна не тэлефанавала...

— А, гэта не адтуль, — нібыта папрасіла прабачэньня тая, што сядзела побач з мастаком.

— А адкуль, дарэчы? — спытаў мастак.

— Ведаеце, — неяк неахвотна пачала журналістка, — я рабіла шэраг інтэрв'ю: хіты даўніх год, бестселеры даўняга часу, самыя касавыя фільмы...

— Наўрад ці яе рамансы — хіты... — пачаў ён.

— Ну, ня ў тым справа, — засьпяшалася жанчына, — потым яна прыйшла са сваёй новай кніжкай і з гэтым здымкам...

— Удалы здымак...

— Магчыма, — жанчына пачала вымаць з пульхнага канверту здымкі, — а вось тое, што павінна вас цікавіць.

Ён перабіраў адбіткі:

— А што тая серыя перадачаў?

— Хутчэй за ўсё адыдзе ў нябыт разам з яе героямі, — пасьпешліва адказала жанчына, — няма сродкаў.

— Та-а-ак, — працягнуў ён: і нельга было зразумець — шкадуе ён ці не.

Ён зноў уважліва паглядзеў на жанчыну:

— Вялікі дзякуй. Я магу зрабіць копіі?

— Яны ўжо ў вас.

— Дзякуй, — ён шматзначна паглядзеў жанчыне ў вочы.

— Стамілася, — неяк утульна, па-хатняму пацягнулася яго інтэрв'юерка.

— Я закажу таксоўку.

— Ня трэба. Мая хата побач.

— Ну, то ў нас будзе невялікі шпацыр? Перад вялікімі вандроўкамі?

— Ня варта загадваць, — засьмяялася жанчына. — Пайду вазьму канверты.

Калі яна выйшла, мастак зноў пачаў перабіраць фота — здымкаў

дзяўчыны з канём было два. І адзін з іх ён паклаў у стос сваіх адбіткаў.

Жанчына прынесла некалькі прыгожых, глянцавых канвертаў. І мастак паспрабаваў засунуць канверт са здымкамі ў кішэню, потым запіхнуў за штрыфель паліто.

— Не-не, — занепакоілася журналістка, — давайце мне ў сумку.

...На вуліцы падаў лёгкі, негусты сьнег. Яны перакідваліся фразамі, што ня мелі ніякага значэньня і раставалі ў паветры, як сьняжынкі.

Жанчына спынілася каля дома, у якім на першым паверсе прыветна сьвяціў вокнамі гастраном.

— Вось я і прыйшла, — жанчына падала яму канверт, і з яго выпаў фотаздымак паэтэсы.

— Даруйце, ня ўгледзела, — голас жанчыны набыў нечаканыя жорсткія ноткі.

Яна падняла здымак і кінула яго каля сьметніцы.

...Мастак доўга разьвітваўся з інтэрв'юеркай, потым падышоў да сьметніцы, каб падняць здымак, але яго ўжо не было. Зьнік.

Мастак пайшоў на тралейбусны прыпынак. Ён ня ўмеў і не хацеў вучыцца вадзіць машыну або заводзіць шафёра. З яго пасьмейваліся, аднак ён упарта ціснуўся ў грамадскі транспарт і выкідваў грошы на таксоўкі. Не даходзячы да прыпынку, ён ускінуў руку перад таксоўкай і праз некалькі хвілінаў быў дома.

А ў сьне ён усё бачыў паэтэсу на тым самым прыгожым кані, што на здымку. Яна была такая ж маладая, як на здымку, весела сьмяялася і гарцавала-гарэзавала на тым кані, скакала па крузе, а ён стаяў і ніяк ня мог выйсьці з таго кола.

... Ён рыхтаваўся ехаць у Італію, бегаў з паперкамі, каб выправіць візу, нешта зьбіраў, некуды званіў, добра забыўся пра тое інтэрв'ю, а тым больш пра фотаздымак. І неяк, ускочыўшы ў маршрутку і сеўшы побач з кіроўцам, проста ўпёрся ў фотаздымак: дзяўчына ў жакейскім уборы глядзела проста ў вочы мастака, а прыгожы конь касіў на яго незадаволены позірк.

— Адкуль гэта ў вас? — чамусьці адразу спытаў ён.

— А што? Падабаецца?

Мастак заўважыў плямы на здымку. Не інакш, кіроўца падабраў тады вечарам.

— Ну...— пачаў было мастак.

— І мне падабаецца, — засьмяяўся кіроўца. — Дзе вам выходзіць?

Мастак выйшаў непадалёку ад свайго дому. У хаце, ён узяў з паліцы тэлефонны даведнік і набраў нумар. Ніхто не адказваў. Ён падышоў да кампутара. Нумар тэлефону зьмяніўся. Ён зноў націснуў на кнопкі.

— А хто гэта? — на яго пытаньне адказаў пытаньнем малады жаночы голас.

— Даўні... — ён запнуўся, — знаёмы.

І на тым канцы проваду яму пасьпешліва адказалі:

— Яна загінула два гады таму, — і павесілі трубку.

...Яна была маладзейшая за яго гадоў на пятнаццаць, калі не на ўсе дваццаць...

Ён паглядзеў у люстра — на свой сьветлы, маладжавы твар. Узяў нататнік:

— Спадзяюся, вы памятаеце пра нашую дамову? Праз два месяцы пачынаюцца здымкі ў Італіі... Я разьлічваю на ваш удзел...

## *О'Кей!*

### *Маналог дзейнай асобы кірмашовага часу*

Я адчыню дзьверы ў дваццаць першае стагоддзе. У Трэцяе тысячагоддзе. Пхну гэтыя дзьверы левым чаравікам. У фірмовым абутку. Сорак чацьвёртага памеру. Зусім нармалёвы памер для майго росту: метр восемдзесят сем. Увогуле — фактура зусім ня зганьбіла б вокладку «Плэйбоя» ці яшчэ якога прыстойнага альбо ня вельмі выданьня. Круты хлопец. Супермэн. І галава — не качан капусты. У школе я, праўда, з траякоў не вылазіў, паступаў, абляпіўшыся рэпетытарамі. Юрфак неяк прамахнуў — але: на халеру мне тая юрыспрудэнцыя! На нашай глебе што Шэрлак Холмс, што Эркюль Пуаро даўно шызануліся б! Ня кажучы пра якога Пляваку ці Коні.

Я ня быў дурнем, адразу скеміў, што да чаго. Пракруціў некалькі аперацыяў, што той Напалеон. Сёньня — кум каралю. Рахунак за мяжой, у надзейнай краіне. Тут — кручуся, як падпалены. Затое Парыж варты імшы. У прамым і пераносным сэнсе. Дваццаць шэсьць гадоў. Малады, персьпектыўны, энергічны. Ёсьць — галоўнае. Ёсьць — грошы. Усё — о'кей! Каго хочаш пераплюну, каго заўгодна — падстаўлю. Я ня Дон Кіхот. Гэты сімпатычны ідальга хай сабе натхняе дзівакоў, калі яны засталіся. Або — фарысеяў, якія ствараюць сабе надзейна-рамантычны імідж. Мне ўсё роўна.

Між іншым, я мяняю свой цёмны пад'езд і ўтульную бабчыну трохпакаёўку ў «спальным раёне», што сёньня пасьпяхова ператвараецца ў «гарлем для белых» (хаця наконт колеру скуры — магчымы варыянты). Дык вось — перамяшчаюся ў хату, дзе код параднага будзе жалезна закадзіраваны, лесьвіца надзейна мытая, а праз сьценку я не пачую, як чвякае мой сусед.

Чакаю трагароў. Павінны прыехаць праз дзьве гадзіны, грузіць мае прычындалы. Але сантыменты, як казалі ў старасьвеччыне, не мая стыхія. І не маёй бабкі. Супербабкі, скажу вам. Каб сёньня ды яе маладыя гады — ціп-топ мадэлька. Аднак — трымаецца і так. Кась-

метыку чалавечых сувязяў разумее, як найлепшы іміджмейкер. Мой ангельскі — ад яе. Маці падупала пасьля ад’езду бацькі. Той заўсёды любіў фасады, вокладкі, адным словам, абгортку рэчаў, іх вонкавы «прыкід». Сэнс, зьмест яго не цікавілі. Мая маці таксама, мабыць, прывабіла гэтым. Бабка шастала па замежжы — перакладчыца, — прывозіла сякое-такое шмацьцё. Мая маман у сваім імпартовым візажы сярод саўковых элегантак а ля куцюр’е з індпашыву выглядала зоркай. І хаця бабка набывала транты не ў Дыёра і нават не ў мадам Шанэль, а ў лаўках «ТАЦІ» і «ТЭКСІ» ды ў розных «Сэкэнд хэндах», дачка яе мела добрую фору перад каляжанкамі. Бацька гэта прыкмеціў. Як пазьней не пакінуў без увагі беларусачку з-за акіяну, зусім не беспасажніцу, што бавіла час на радзіме сваіх продкаў.

Маці тым часам выводзіла ў людзі маладых мастакоў і захлыналася нацыянальнымі ідэямі, гарэла на мітынгах, канферэнцыях, розных форумах. Я, зразумела, быў заняты сабой і не заўважыў: ці то матчынай зьнешнасьці не пайшла на карысьць творчая і грамадская дзейнасьць, ці то панна з-за акіяну мела каларытны настрой і прывабны выгляд незалежна ад грамадскага ці палітычнага надвор’я, але бацька паставіў усіх перад фактам. Якраз на той момант, калі матчыны апекаванцы ўжо ня мелі патрэбы ў яе абароне — і замежныя выставы ладзілі, і славу сваю кавалі, і грашмі шамацелі, пахіхікваючы над матчыным альтруістычным наівам. Яе пуцяводныя палітычныя зоркі таксама пачалі мяняць свае арбіты, а на працы прапанавалі зьмену дэкарацыяў. Маці разгубілася.

Пры гэтым раскладзе выйграў я. Бабка праз нейкі час зразумела, што дачка наўрад ці скарыстае сваю волю на карысьць сабе і зьехала на яе жылплошчу. Я выкіраваўся на кватэру бабкі.

Трымаю нейтралітэт. У сямейных трохкутніках, квінтэтах, актаэдрах, розных іншых геаметрычных варыянтах, якія вымалёўвае пан Гіменэй, пазіцыя выгадная. Маці мяне шкадуе, бабка спрыяе, бацька падчас візітаў на радзіму прывозіць канверты з хрумсткімі паперкамі, а іх ніколі зашмат не бывае. І мне фінансава-кананізаваныя амерыканскія хлопцы вельмі падабаюцца. І супраць «еўрыкаў» я нічога ня маю. Адно слова — у мяне ўсё о’кей!

Пачынаюць, праўда, цікавіцца маім прасьперыты мясцовыя амбалы, але я са сваімі былымі і сёньняшнімі хаўрусьнікамі зладаваў зьвяз: ну, ня тое каб адзін за ўсіх, усе за аднаго. Хутчэй: рука руку мые, калі ён будзе жывы, буду жыць і я. Ну, зразумела, каратэ, дзю-до... Чорны пас мне не патрэбны, аднак паказытаць пятою якое падбароддзе магу. І пісталет маю.

Не вытыркаюся. Сяброў не заводжу. Блізкіх, у кожным выпадку. Машыну прыдбаў, іншамарку, сьціплы «опель». Ёсьць колы і вочы ня коле. Вось за мяжой... Там можна і хвост распусьціць, калі братоў з СНД паблізу няма або якіх старых ці новых рускіх. Прыстойны гатэль, рэстаран — з мясцовай акрасай...

Дарэчы, бабчыну хату добра ўмацаваў — магу аблогу трымаць. На новым месцы давядзецца пачынаць спачатку. А бабчын дом — о! — гэта гібрыд калоніі строгага рэжыму, таннага прытону і прытулку для састарэлых. Як толькі грымнула прыватызацыя, тут пачаўся такі рух! Хадзіў міліцыянт з пастарунка, дык кажа: у бабчыным доме крадзяжоў больш, як ва ўсім раёне. Працуе наводка!

На маім паверсе двое дзецюкоў — некалі іх матку забіў яе амант. Бацька тым часам атабарыўся ў суседнім пад'езьдзе, прыжаніўся, п'янтос: адна зьвіліна ў галаве, і тая выпрасталася без запатрабаваньня. Сынкі ягоныя — адзін, здаецца, мой адналетак, другі гады на два старэйшы — час ад часу трапляюць на скарбовы, дзяржаўны харч. Адзін адседзеў за крадзяжы гады тры, потым у скарбовы дом рушыў другі.

Абодва браты разам з суседскім хлопцам Воўкам, што з кватэры літаральна насупраць нашых дзьвярэй, гадаваліся ў інтэрнаце. Матка братоў была яшчэ жывая і здаровая, Воўкава маці Бэлка — таксама, здаравей не бывае. Выправіўшы дзетак у інтэрнат, яны не сумавалі. Гульбішчы былі чуваць на ўвесь мікрараён, кавалеры хадзілі гуртам, а любошчы заканчваліся зьвернутымі сківіцамі і лямантам.

Да пэўнай пары Бэлка сварылася са сваёй маці, гвалт усчынаўся з самай раніцы. Потым дачка, пакінуўшы сына ад першага шлюбу з маці, зьехала шукаць шчасьце ў Якуцію. Вярнулася адтуль з новым мужам і ўжо досыць падрослым Воўкам.

Воўка ажаніўся ледзь не ў дзявятым класе, і яны з жонкай і сваім гадаванцам, як толькі той устаў на ногі, сядзелі дзень пры дні ў калідоры каля сваіх і, зразумела, нашых дзьвярэй, на скрыні для бульбы (падобна, заўсёды пустой). І лузгалі семкі. Раз-пораз учынялі яны тут мікрараённыя асамблеі, на якія сходзіліся падрослыя бэйбусы — сьмецьце пасьля іх сходак прыбіральшчыца не магла данесьці да сьмецьцеправаду.

Тут мне таксама пашанцавала: да таго часу, як сюды пераехаў я, Бэлка выправілася з усімі нашчадкамі на зямлю абетаваную. Неяк, едучы ў ліфце, пачуў, як дзьве жанчыны, з тых, для каго чужыя справы — найвялікшы інтарэс, гаманілі паміж сабой: Воўкава маці вылечылася паблізу Аравійскай пустыні ад астмы, аднак выхоўвае разам з сынам унука: нявестка адчула там смак волі, спазнала, што рэальныя прасьцягі сьвету куды як больш прывабныя, чымся на сумных мапах у ненавісным інтэрнаце, а, галоўнае, населеныя мноствам мужчынаў, што маюць хэнць і магчымасьць забясьпечыць яе жыцьцёвыя прэтэнзіі на гістарычным атожылку даўжынёю ў адну ноч. З гісторыяй у нявесткі былі яшчэ больш складаныя адносіны, як з геаграфіяй, усе гістарычныя катэгорыі ў яе зьнікалі ў імгненьнях быцьця. Тым часам трэцяя хаўрусьніца Бэлкі пасьля сьмерці адной сяброўкі і ад'езду другой — квітнела і набывала вагу ў прамым і пераносным сэнсе. Самая прыгожая з іх, высокая, мажная, Верка,

кінуўшы свайго законнага, балявала з сяброўкамі, потым падхапіла нейкага ўсходняга чалавека з процьмай грошай, а калі той, адседзеўшы тэрмін яшчэ ў савецкія часы, зьнік у напрамку роднага Азербайджану і жонак-аднаверак, на яе даляглядах зьявіўся сьціплы службовец. Зьявіўся надоўга. Падгадаваліся паміж гарадскім матчыным гармідарам і бабчынай вёскай сыны Веркі, што выявілі нечуваныя камерцыйныя здольнасьці: даляры, марачкі... Верка выкупіла некалькі кватэраў у гмаху маёй бабкі, да пад'езда яна цяпер набліжаецца не інакш, як на «Мерседэсе» або «Ферары», і калі ёй на вочы трапляецца былая настаўніца яе родненькіх двоечнікаў, гружаная цяжкімі ванзэлкамі, Верка паглядае на яе, як заслужаная капланка Венеры на дурноту аскезы і інтэлекту. Пра Венеру і інтэлект Верка, вядома, ня чула, аднак думка яе, падобна, кіруецца наступным чынам: «Была ты, разумніца, дурніцай, дурніцай і сканаеш!»

Як сканаў, дарэчы, адзін дзівак — бачыў яго заўсёды здалёк: пацёрханая куртачка, старыя джынсы. Аднак пасьля яго сьмерці высьветлілася, што ў суседнім пад'езьдзе месьціўся ледзь ня геній — хату яго апанавалі тутэйшыя і замежныя пісакі, бегалі, пыталіся, хто што ведаў пра таго мужыка. А пахавалі яго за кошт царквы.

Усе свае карціны ён таксама адпісаў царкве, праўда, там ня ведалі, што з імі рабіць: абразы і маляваньне на біблейскія тэмы забралі, з астатняга наладзілі выставу — вось тут і пачалося! І грошы, і слава... А кажуць, пры жыцьці не заўсёды меў і на хлеб... Шкада, я ня ведаў. Можа, і набыў бы што — задарма.

Аднак што мае згрызоты — у вялікай роспачы была цётачка з першага паверху. Тыя ж суседкі-ўсяведкі пра яе гаманілі: мела хобі, усё выходзіла замуж, разоў пяць ці сем. Кожным разам — у белым уборы, з флёр-д'аранжам. Дык вось яна ледзь ня рвала на сабе валасы. А-ёй! Такі жаніх быў пад бокам! Увагу ж да яе меў! Роспач яе трохі зьбіў шлюб дачкі — пайшла ў замужжа ў замежжа.

Я было ледзь не набыў аўтапартрэт нябожчыка — знайшлі ў хаце яшчэ аднаго небаракі, што зьехаў на хлябы да сястры. Усё хадзіў— зьбіраў недакуркі. Дык вось — я ўхапіў быў той партрэт. Ажно прыгледзеўся да твару мастака — не, глядзець яму ў вочы: звар'яцець. А я прагну жыцьця дзейснага і спакойнага. Па поўнай праграме. На халеру мне гэты інквізітар? Я вазьму ўсё пры жыцьці і пакутаваць ня буду. Не хачу! У мяне ж яшчэ ўсё наперадзе!

Адно я для сябе ня вырашыў канчаткова, застацца тут ці падацца ў Новы ці Стары, як кажуць, цывілізаваны, сьвет. На сваёй глебе ты — гаспадар. Аднак трэба гэты цалік і ўзараць, і ўлагодзіць, і дагледзець, а калі яшчэ той ураджай! Ды і ці будзе?

У мяне ўсё распланавана і прадугледжана. Не люблю стыхію. Вырашыў вось зладаваць сабе рэлаксэйшн, не якое-небудзь там рэкламнае Фу-фу; Кіпр ці Турцыя. Паехаў у Скандынавію, Гішпанію і наастатак у Дойчланд. Дык у тым Дойчляндзе мяне так прыхапіла:

якое там вандраваньне па Гарцы, замест казкі — пярун, паводка і гэтак далей.

Ледзь са сваёй Шэнгенскай візай у Бэль Франс выбраўся. Парыж як Парыж, Луара як Луара, аблазіў усе д'Амбруазы, Во-ле-Віконты, быў і ў Камп'енскім палацы, і ў знакамітым парку Шанціійі... Дэгуставаў савіньёны, шаблі, лафіты, совэтэры, монсэгуры... Спрабаваў вустрыц... Шкадаваў, што ў маёй Шэнгенскай візе пазначана: бяз права набыцьця нерухомай маёмасьці. Набыў бы шале. Менавіта шале: добрую хату на пленэры, а не шато — палац. Безумоўна, прыемна, калі табе ў талерку зазірае чарада стагоддзяў, аднак клопату не абярэшся... Вунь нават Жан Марэ ў сваю пару загнаў свой замак...

Ну, а пакуль што я тут. У сваёй краіне. Пераязджаю ў цэнтр. У прэстыжны раён. Кватэра — ня горш, як дзе-небудзь у Сэн-Жэрмэн... Ну, амаль што... Гуд бай, гарлем! Гуд бай, настаўнічкі! Гуд бай, нішчымная галястра! Гуд бай, крымінальнікі-суседзі! Гуд бай! Я шыбую ў трэцяе тысячагоддзе!

Вунь і трагары пад'язджаюць! Бягу!

О'кей!

*Ліпень 2000 г.*